# АХВЯРЫ СЬВЯТЛА

Калі мы ўваходзім у тэатр, нас ужо ў фае асьляпляюць і прычароўваюць іскрыстыя промні жырандоляў, што адбіваюцца ў высокіх люстэрках, паркеце і мармуры, фатаграфіях “зорак” тутэйшае сцэны, золаце шыкоўна апранутых жанчын. Шарль Бадлер меркаваў, што і ў спэктаклі галоўнай дзеючай асобаю зьяўляецца менавіта жырандоля над заляй — “цудоўная блішчастая рэчавіна, празрыста-крыштальная, складаная, круглая і сымэтрычная”.

Магічнаю можа стацца любая прастора, калі бег часу і рухаў уласнага цела ў ёй падпарадкаваць пэўнаму рытму. Напрыклад, штодня ўзьнімаць і апускаць перад сабою галоўны рэквізыт чалавечай гісторыі — сонца. Навука і цяпер ня можа даць адказу, ці варта было дзеля нашага спэктаклю паліць гэтую жырандолю. Пакуль вядома толькі, што некаторыя гульні ня вартыя нават сьвечак.

На працягу тысячагодзьдзяў культ сонца яднаў чалавека ня толькі з супляменьнікамі, але і з усімі расьлінамі і бальшынёю жывёлаў. Сьвятарным жа цэнтрам сям’і, ролю якога цяпер адыгрывае тэлевізар, быў нязгасны агмень пасярод пячоры ці юрты. Хатні агонь лічыўся жывым, ён вячэраў зь людзьмі і сымбалізаваў шматвяковае адзінства роду. У агмень нельга было кідаць сьмецьце, забаранялася і варушыць вуглі нажом, каб не параніць полымя.

Захавальніцамі агню, як цяпер тэлепраграмы на тыдзень, звычайна былі дзяўчаты. У Рыме сьвятарны агонь горада ахоўвалі жрыцы-вэсталкі (як і савецкія школьніцы, што стаялі пазьней у ганаровай варце ля Вечнага агню на плошчы Перамогі, яны мусілі захоўваць цноту).

Аб’ектам культу можа стацца любая крыніца сьвятла, фізычнага альбо духоўнага: асьветнікі і бадхісатвы, мэмарыял спаленай карнікамі вёскі, “лямпачка Ільліча”. Асноўным рытуалам рэлігіі інкаў было сузіраньне руху ценяў на адмысловым сонечным гадзіньніку. У Савецкім Саюзе камуністы жартам казалі: “Нам сонца ня трэба — нам Партыя сьвеціць!”.

Сымболіка агню скарыстоўваецца, мабыць, ва ўсіх рэлігіях і палітычных сыстэмах (напрыклад, на ўсіх трох гербах Беларусі — гістарычным, савецкім і лукашэнкавым — зьзяе сонца). Хрысьціянскія цырымоніі саграваюцца цяплом сьвечак. Адзін з сымбаляў ісляму — мінарэт (“вежа сьвятла”, “маяк”) — этымалягічна роднасны ня толькі назову галоўнай радыёстанцыі СССР, але і сымбалю юдаізму — мэноры (семісьвечніку).

Усялякі культ патрабуе ахвяраў — і ня толькі ад нас, але і ад нашых багоў. Біблейскі бог падзяліўся зь людзьмі спачатку духам, а праз Хрыста — і сваёй крывёю. Ацтэкі меркавалі, што цяперашняе сонца (яно на іхным небе было пятае па ліку) нарадзілася ў велізарным вогнішчы, у якім бог Кетцалькаатль спаліў уласнага сына, а першыя людзі былі створаны з попелу і ахвяраванай багамі на гэтую справу крыві. У сваю чаргу, багі жывяцца постам альбо ахвярамі вернікаў. Ацтэкі штодня ахвяравалі сонцу выдраныя з грудзёў сэрцы, бо былі ўпэўненыя, што лепшае паліва для яго — гэта чалавечая кроў (мабыць, таму, што сонца на сьвітанку чырвонае). У індзейцаў майя існаваў звычай мужчынскага ахвяраскладаньня: удзельнікі рытуалу зьбіраліся ў храме, дзіравілі сабе чэлясы і нанізвалі іх, нібы пацеркі, на агульны шнурок, а потым абмазвалі крывёю выяву свайго бога, каб не памёр ад смагі.

Ахвярная кроў злучае жывых, нябожчыкаў і багоў у агульнае несьмяротнае цела. Хрыстовая кроў, ужываная ў выглядзе прычасьця, яднае вернікаў з усімі хрысьціянамі, дзе б і калі б яны ні жылі — нават да нашай эры.

Агонь чысты сам і ачышчае тых, хто яго сузірае. Мэта ўсялякай трагедыі — катарсыс (ачышчэньне) гледачоў праз спачуваньне герою, які ахвяруе сабою, каб жыцьцё астатніх людзей сталася крыху сьвятлейшым. Пасярод першага эўрапэйскага тэатру ў старажытных Атэнах гарэў ахвярнік Дыяніса — і гэта можа патлумачыць нам, чаму тэатральныя заслоны заўсёды чырвонага колеру, і чаму якога б колеру ні было сьвятло, што залівае магічную прастору сцэны, — яно заўсёды нагадвае кроў. Сучасны тэатр паходзіць з крывавых містэрыяў сярэднявечча й антычных вакханаліяў — рытуальных оргіяў з ахвяраскладаньнямі ў гонар Дыяніса (Вакха). На адным з такіх карнавалаў вакханкі разадралі вядомага сьпевака Арфея (такая ж доля пагражае сучасным эстрадным зоркам — таму яны не пагаджаюцца даваць канцэрты безь целаахоўнікаў). Грэкі штогод — у дзень найвышэйшага сонца — сымбалічна забівалі і самога Дыяніса ў абліччы быка ці казла, каб прымусіць яго зноў нарадзіцца зімой (на Каляды).

Рытуал забойства спачатку татэмных жывёлаў, а потым і багоў быў пашыраны сярод многіх плямёнаў, у тым ліку славянаў. Удзельнікі абраду рабілі вялікую ляльку ці апраналі богам палоннага. Спачатку ім усяляк паказвалі сваю любоў і шанаваньне, а потым пудзіла спальвалі альбо тапілі ў рацэ, а падобнага да бога чалавека зьбівалі на горкі яблык ці сапраўды забівалі з надзеяй, што ўвесну разам з ахвяраю ўваскрэсьне пасьля зімовага сну і прырода. Рытуальнае катаваньне бога суправаджалася сьмехам і радаснымі скокамі: продкі верылі, што сьмех мае вялікую магічную сілу і найлепш дапаможа забясьпечыць добры ўраджай. Ва ўсіх гэтых дзеяньнях ужо прысутнічалі тэатральныя элемэнты: нязьменны сцэнар, адмысловая вопратка й маскі ўдзельнікаў, сакральная пляцоўка, што мела зручнае выйсьце ў іншасьвет.

Паводле тыбэцкае “Кнігі мёртвых”, усе нябожчыкі праходзяць выпрабаваньне пякучым сьвятлом вышэйшай рэальнасьці, і тых, хто ня здольны трываць гэтае сьвятло, чакае не вызваленьне зь бясконцага кола рэінкарнацыі, а чарговая роля (нараджэньне ў новым абліччы). Дамагільнае жыцьцё мае падрыхтаваць нас да незваротнага нараджэньня ва ўлоньне нязгаснага сьвятла і нястомнай любові.

Для нашых сучасьнікаў ролю сакральнага іншасьвету найчасьцей адыгрывае тэлерэкляма. У дасканалым сьвеце рэклямных мітаў пануюць незямная прыгажосьць, шчасьце, любоў ды іншыя вечныя каштоўнасьці, упакаваныя ў тавары апошняй мадэлі. Калі мы параўноўваем уласнае жыцьцё з подзьвігамі герояў сусьветнага супэрмаркета — у нас зьяўляецца адчуваньне, што мы самі яшчэ як сьлед не нарадзіліся.

Зрэшты, тэлеэкран залівае прыцемкі нашых кватэраў ня столькі сьвятлом, колькі халоднай крывёю: найвышэйшы рэйтынг маюць навіны пра катастрофы і тэрарыстычныя акты, фільмы і рэпартажы з бойкамі і перастрэлкамі. Крывавыя відовішчы — адзінае, што масавы глядач гатовы спажываць у неабмежаванай колькасьці. У глыбіні душы людзі мала вераць у існаваньне навакольнага сьвету і хочуць бачыць ягоную кроў, каб пераканацца, што ён сканаў яшчэ ня ўвесь.

Тэлевізійныя вежы не выпадкова нагадваюць трубы крэматорыя апраметнай. Можна пагадзіцца зь Віктарам Пялевіным, што тэлевізар

зьяўляецца нашчадкам распаўсюджаных калісьці на Блізкім Усходзе печаў для чалавечых ахвяраскладаньняў (мы жыўцом падсмажваемся ў пекле, а не заўважаем гэтага таму, што замест полымя бачым рэклямныя ролікі), але гэтыя печы пакінулі значны сьлед і ў гісторыі тэатру, і ў гісторыі царквы. Найбольш папулярным сюжэтам у сярэднявечнай драматургіі была біблейская гісторыя пра кінутых у печ бабілёнскімі халдэямі і ўратаваных анёлам юнакоў, якія адмовіліся пакланіцца залатому ідалу (на гэтую ж тэму Сымон Полацкі пазьней напісаў першую ў Расеі п’есу “Пра Навуходаносара цара, пра залатое цела і трох юнакоў, у печы ня спаленых”). Каталікі рабілі інсцэніроўку гэтага паданьня на могілках альбо на плошчы перад касьцёлам, праваслаўныя ж будавалі двух’ярусную печ і сцэну ў царкве — пераатваралі ў спэктакль зь піратэхнічнымі эфэктамі саму літургію (звычайна ў адну з ранішніх службаў перад Калядамі).

На думку Жана Както, сам тэатр — велічэзная печ: “Той, хто і не падазрае пра гэта, усё адно паволі падсмажваецца там альбо згарае імгненна”. Сапраўды, падчас спэктаклю станоўчыя героі імкнуцца запаліць, нібы сьвечкі ў храме, душы гледачоў сваім нутраным сьвятлом. Ліхадзеям жа кожны паказ, нават калі іх іграюць кепскія акторы, дазваляе адпачыць некалькі гадзінаў ад катаваньняў у пекле: замест іх там у гэты час палаюць душы артыстаў.

Некаторыя афрыканскія плямёны падсілкоўваюць полымя ў сьвятарным агмені вёскі адмысловымі кавалачкамі дрэва, у якіх жывуць душы продкаў (беларускія сяляне, пакуль у хатах не было тэлевізараў, таксама верылі, што менавіта праз печ адлятаюць да неба душы нябожчыкаў). Ня выключана, што і мы сёньня ня самі спапяляем свае жыцьці перад тэлеэкранам: у ахвярнік сусьветнае вёскі нас падкладаюць рукі нашчадкаў.